# АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАГА КІНЕМАТОГРАФА І КІНАПРАКАТУ Ў ДАВАЕННЫ ЧАС

***І. П. Клімаў,***

*дацэнт кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

Кінапракат з’явіўся на тэрыторыі Беларусі яшчэ ў пачатку XX ст., калі ў Расійскую імперыю з Парыжа прыйшла навінка, вынайдзеная ў пачатку 1890-х гг. Ужо ў 1896 г. адбыліся першыя кінадэманстрацыі ў Санкт-Пецярбургу, Кіеве, Варшаве і іншых гарадах імперыі (у Вільні – у 1897 г. пад назвай «аніматограф»). Аднак першыя кінадэманстрацыі на тэрыторыі сучаснай Беларусі, паводле звестак перыёдыкі таго часу, прайшлі ў Гомелі ў 1909 г., а ў 1910–1912 гг. у Віцебску, Мінску, Гродне і інш. [5, с. 7]. Першапачаткова кінадэманстрацыі праводзіліся ў розных мясцінах, ад саду да тэрасы кавярні, аднак даволі хутка пачалі ўзнікаць кінатэатры (ілюзіёны), якімі служылі вялікія памяшканні, часам з аркестрам ці раялем, што акампанавалі відовішчу. Кінадэманстрацыі ўяўлялі сабой бізнес і суправаджаліся агрэсіўнай рэкламай [5, с. 8–9, 10–11, 13], а таксама акампанементам музычных інструментаў (не толькі раяля, але гармоніка, балалайкі і інш.), дэкламацыямі, чытаннем лекцый, танцамі, пантамімамі і нават вар’етэ [5, с. 9]. Дэманстраваліся замежныя і расійскія фабульныя і пазнавальныя кінастужкі. Кінематограф хутка стаў масавым і дэмакратычным, абагнаўшы паводле ліку наведвальнікаў тэатр і нават цырк.

Значную ролю кінематографа ў справе прапаганды дзяржаўнай ідэалогіі ўлады ўсвядомілі з пачаткам Першай сусветнай вайны. Таму ў Расійскай імперыі пачалі здымацца патрыятычныя і антынямецкія мілітарысцкія фільмы [5, с. 12–13]. Аднак у поўнай меры выкарыстоўвалі кінематограф у мэтах індактрынацыі насельніцтва бальшавікі. У 1918–1919 гг. усе кінатэатры ў Беларусі былі нацыяналізаваныя [5, с. 14–15], аднак з надыходам нэпа ў Савецкай Беларусі камерцыйнае выкарыстанне кінаўстановак аднавілася. Камерцыйнае вымярэнне кіно заставалася актуальным для бальшавіцкіх улад на працягу ўсяго даваеннага часу, ва ўмовах будаўніцтва сацыялістычнага грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Кінапракат.** Пракатам савецкіх і замежных фільмаў у БССР займаўся трэст Белдзяржкіно, створаны рашэннем партыйных улад у канцы 1924 г.; да таго кіно апеквалася наркаматам асветы. Спачатку трэст меў усяго 4 кінатэатры, але ўжо ў 1927 г. ён валодаў у рэспубліцы 11 кінатэатрамі і 50 кінаперасоўкамі, якія абслугоўвалі вёску; у 1932 г. яму належалі 61 стацыянарная кінаўстаноўка і 376 вясковых кінаперасовак [2, с. 6, 8, 118][1]. Ужо ўлетку 1925 г. у Мінску былі адкрыты курсы кінамеханікаў [5, с. 20; 11, с. 14–15]. Сярод задач Белдзяржкіно былі не толькі камерцыйны пракат фільмаў, але і правядзенне палітасветніцкай працы сярод насельніцтва ды вайскоўцаў і здыманне ўласных фільмаў (з 1925 г. пераважна кінахроніка) [2, с. 10–16, 63–66; 5, с. 21–23;][2]. У 1920-я гг. савецкіх фільмаў было вельмі мала і яны не карысталіся папулярнасцю, у БССР у асноўным дэманстраваліся замежныя і расійскія дарэвалюцыйныя карціны, аднак у 1930-я гг. іх суадносіны змяніліся на адваротныя [2, с. 9][3].

**Кінавытворчасць.** Першым фабульным фільмам Белдзяржкіно стала карціна *Лясная быль* на рэвалюцыйную тэматыку, знятая ў 1926 г. паводле сцэнарыя М. Чарота і набыўшая пэўную папулярнасць, так што яе нават у 1928–1929 гг. меркавалі пра-цягнуць новай серыяй *Грышка-свінапас* [2, с. 24–32; 5, с. 30–40; 11, с. 24–28][4]. Спачатку здыманне фільмаў адбывалася ў розных кінаатэлье Масквы, аднак у 1927–1928 гг. паводле пастановы СНК БССР у Ленінградзе, дзе тады існавала найлепшая ў СССР кінематаграфічная база, была створана кінафабрыка Белдзяржкіно, якой пры адкрыцці (увосень 1928 г.) надалі назву *Савецкая Беларусь* [2, с. 6–7; 11, с. 48–50][5]. Колькасць фільмаў, знятых Белдзяржкіно ў міжваенны час, была невялікая (табл. 1), толькі ў 1930–1932 гг. іх лік адметна ўзрос за кошт нескладаных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[1] У пачатку 1925 г. у БССР існавала 53 стацыянарныя кінатэатры і 3 кінаперасоўкі, а ў пачатку 1929 г. – 204 стацыянарныя кінаўстаноўкі і 170 кінаперасовак [11, с. 35, 66]. Паводле іншых звестак, у 1925 г. у БССР існавала 41 сталая кінаўстаноўка і 55 клубных, а на вёсцы – 25 кінаперасовак [3, с. 48].

[2] На мяжы 1930–1931 гг. сектар кінахронікі Белдзяржкіно, што знаходзіўся ў Мінску, быўператвораны ў беларускае аддзяленне Саюзкінахронікі, якое павінна было пастаўляць сюжэты для беларускіх і агульнасаюзных кінажурналаў; аднак праз некалькі гадоў яго праца прыйшла ў заняпад. У 1935 г. аддзяленне зноў было ператворана ў Мінскую студыю кінахронікі [2, с. 63, 120; 5, с. 135–148; 11, с. 17–18, 34, 69–70, 76–78, 143–123].

[3] Так, улетку 1929 г. на экранах БССР на замежныя фільмы прыпадала 85%, але ўжо ў першай палове 1931 г. сітуацыя была адваротная: толькі 10% прыпадала на замежныя фільмы [11, с. 16, 85]. Якраз у гэты перыяд разгарнулася барацьба з паказамі замежных фільмаў, што неслі «заганныя» буржуазныя вартасці.

[4] У адным з эпізодаў фільма *Лясная быль* зняліся нават кіраўнікі Савецкай Беларусі – Я. Адамовіч, В. Кнорын, А. Чарвякоў, – якія ігралі саміх сябе. Пад назвай *Грышка-свінапас* выйшла толькі версія для дзяцей, створаная з нявыкарыстаных матэрыялаў *Лясной былі* [2, с. 20–21, 32].

[5] З пачатку 1936 г. усе кінафабрыкі ў СССР былі перанайменаваны ў кінастудыі [11, с. 126–127].

агітпрапфільмаў і ваенна-вучэбных фільмаў [5, с. 24–30, 76–87; 11, с. 89–90, 92–97, 100].

*Табліца 1*

**Лік кінафільмаў, знятых Белдзяржкіно і на кінастудыі *Савецкая Беларусь* у 1925–1940 гг.**

| Фільмы: | 1925 | 1926 | 1927 | 1928 | 1929 | 1930 | 1931 | 1932 | 1933 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| фабульныя | - | 2 | 4 | 4 | 4 | 7 | 6 | 3+5* | 2+2* |
| іншыя | 2 | ? | 2 | 5 | 7 | 22 | 9 | 5 | 3 |

| Фільмы: | 1934 | 1935 | 1936 | 1937 | 1938 | 1939 | 1940 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| фабульныя | 1+2* | 3* | 4* | 3* | 4* | 2* | 2* | 60 |
| іншыя | ? | ? | 3 | 1 | ? | 4 | 1 | 64 |

*Заўвага.* Да фабульных фільмаў адносяцца мастацкія і агітацыйна-прапагандысцкія; датаванне фабульных фільмаў праведзена паводле даты планавага выпуску, хаця тэрміны часта не вытрымліваліся і фільмы здаваліся ў наступныя гады; з 1932 г. асобна вылучаюцца гукавыя (пазначаны зорачкай) і нямыя фільмы; да іншых фільмаў адносяцца: дакументальныя, навукова-папулярныя і культурна-асветніцкія, вучэбныя, хранікальныя і мультыплікацыйныя, звесткі пра іх няпоўныя, да іх у табліцы не дададзены даныя па кінахроніцы, знятай аператарамі М. Лявонцьевым і Я. Гласам ў 1925–1927 гг. (32 фільмы) [1, с. 9–105; 2, с. 248–256; 261–263].

Раннія гукавыя карціны, што пачалі здымацца на фабрыцы ў Ленінградзе з 1932 г., былі нізкай якасці і даволі сціплымі на рэплікі персанажаў, пэўны час разам з гукам у іх выкарыстоўваліся і надпісы. Большасць савецкіх гукавых фільмаў да канца 1930-х гг. мелі свае нямыя варыянты з надпісамі, паколькі гукавых кінаўстановак у рэспубліцы было няшмат (табл. 2). Ранейшыя нямыя фільмы, як правіла, не агучваліся, напрыклад, са стужак *Савецкай Беларусі* толькі адзін фабульны фільм *Першае каханне* (1933) быў агучаны ў 1937 г. [2, с. 76–77]. Прычыны гэтага былі палітычныя: рэгулярныя пошукі ў 1930-я гг. праяў беларускага ці яўрэйскага нацыяналізму ў ранейшых фільмах, асабліва знятых у 1920-я гг. [2, с. 128]. У першай палове 1930-х гг. тры ўжо знятыя фільмы кінафабрыкі ў Ленінградзе былі нават забароненыя да пракату з прычыны ідэалагічнай нявытрыманасці ці контррэвалюцыйнай накіраванасці [2, с. 129–130, 147–148]. З гэтых прычын сцэнарыі многіх фільмаў на працягу 1930-х гг. падлягалі бясконцым пераробкам і пераздыманням (часам нават значнага матэрыялу), калі занятыя ў фільме акцёры былі рэпрэсіраваны [2, с. 144]. Гэта зацягвала тэрміны выхаду на экран, іншы раз нават на гады.   У выніку на кінастудыі *Савецкая Беларусь* адбіраліся для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

экранізацыі выпадковыя сцэнарыі, а здыманне часам вялі выпадковыя рэжысёры, што прыводзіла да выпуску штучных паводле сюжэта і нізкіх у мастацкім плане кінакарцін, нават аж да відавочнай халтуры [11, с. 50–58, 61–62, 79–82, 101–102, 112–113, 130], хаця музыку для многіх стужак беларускай кінафабрыкі ў Ленінградзе пісалі вядомыя расійскія кампазітары І. Дунаеўскі, В. Салаўёў-Сядой, С. Пракоф’еў.

**Праблемы кінавытворчасці.** Праблемы паміж кінастудыяй, якая знаходзілася далёка ад Беларусі, і мінскім кіраўніцтвам, а таксама творчай беларускай інтэлігенцыяй існавалі на працягу 1930-х гг. [2, с. 121–123; 5, с. 103–107; 11, с. 85–86, 101–103, 118–119, 130, 137, 145]. Супрацоўнікі кінастудыі не жадалі працаваць ні з беларускімі акцёрамі, ні з беларускімі пісьменнікамі і сцэнарыстамі, паколькі тыя здаваліся ім занадта правінцыяльнымі, неадпаведнымі агульнасаюзным маштабам, у дадатак, у эпоху рэпрэсій існавала пагроза абвінавачванняў у беларускім нацыянал-дэмакратызме [2, с. 110]. Хаця ў пачатку 1930-х гг. мінскімі ўладамі рабіліся актыўныя захады наконт экранізацыі твораў вядомых беларускіх пісьменнікаў [2, с. 127; 11, с. 73–74, 82, 83–84, 101–102, 112–113, 118–119, 136], аднак, як правіла, беспаспяхова[6]. А. Некрашэвіч, беларускі дырэктар кінастудыі ў 1931–1935 гг., у першай палове 1930-х гг. рэгулярна абвінавачваў яе рэжысёраў і сцэнарыстаў у вялікадзяржаўным ігнараванні беларускай тэматыкі і няведанні беларускай мовы [2, с. 122–123]. Сітуацыя накалілася ў 1934 г., калі ён выступіў у друку з шэрагам крытычных артыкулаў па гэтым пытанні, што вясной 1935 г. выклікала ў БССР крытыку ўжо яго і зняцце з пасады. Хаця ўлады разумелі наяўнасць пэўнай праблемы, аднак вырашыць яе не маглі. Адсутнасць нацыянальнага рэпертуару і ўласнага мастацкага аблічча ў беларускай кінастудыі ў Ленінградзе ўлады былі вымушаны канстатаваць у 1936 г. на агульнасаюзным узроўні.

Знаходжанне кінапляцоўкі за межамі рэспублікі моцна замінала развіццю беларускага кінематографа [11, с. 49]. Яшчэ ў 1932 г. улады планавалі перанесці кінастудыю з Ленінграда ў Віцебск, а ў 1934 г. СНК прыняў рашэнне будаваць кінакамбінат у Мінску [2, с. 139; 5, с. 104], аднак недахоп сродкаў у гады другой пяцігодкі прымусіў адкласці гэтыя планы. Толькі пасля ліквідацыі трэста

[6] Так, з красавіка па жнівень 1931 г. працу кінафабрыкі ў Ленінградзе вывучала камісія ЦКК і ЦК КП(б)Б, якая канстатавала недастатковую ўвагу да нацыянальнай тэматыкі і слабую падрыхтоўку нацыянальных кадраў, але вынікам працы камісіі сталі бюракратычныя induce пературбацыі і павелічэнне штату кінафабрыкі амаль удвая [11, с. 85–87].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Белдзяржкіно вясной 1938 г. пачаліся захады да стварэння кінапляцоўкі ў Мінску[7], дзе вясной 1939 г. размясцілася студыя *Савецкая Беларусь*. Але і тут частка яе павільёнаў яшчэ і ў пачатку 1941 г. не была гатова для працы, таму фільмы здымаліся на розных кінастудыях СССР [2, с. 151; 11, с. 141].

**Кадры.** У кінематографе Савецкай Беларусі дамінавалі небеларусы, па крайняй меры, спачатку[1]. Рэжысёры фільмаў Белдзяржкіно былі выхаванцамі расійскага тэатра або кінематографа (Ю. Тарыч, У. Гардзін, У. Корш-Саблін, Э. Аршанскі, А. Файнцымер і інш.), у іх амаль заўжды здымаліся расійскія акцёры, у якасці сцэнарыстаў часта запрашаліся расійскія творцы. Усе будучыя беларускія рэжысёры ў канцы 1920-х гг. накіроўваліся на вучобу ў Маскву [12, с. 185]; у Ленінград на навучанне з 1930 г. мусілі ехаць і будучыя сцэнарысты [2, с. 126–127; 11, с. 67][2]. Сярод нешматлікіх працаўнікоў Белдзяржкіно дамінавалі яўрэі: у 1926–1929 гг. іх доля вагалася ад 80 да 66,7–69,1%, але наступнай этнічнай групай паводле колькасці былі беларусы: іх доля вагалася ад 18,9 да 26,7–25,5%, рускіх былі адзінкі [12, с. 186]. З 1928 г. уся перапіска Белдзяржкіно з установамі ў БССР, як і рэклама фільмаў у кінатэатрах рэспублікі вялася на беларускай мове [7, с. 25]. Аднак у рэзалюцыі Першай Усебеларускай нарады сцэнарыстаў, прынятай 06.03.1931 г., адзначалася «адсутнасць актыўнай палітыкі па беларусізацыі апарату трэста і кінафабрыкі» і звярталася ўвага на небяспечны адрыў кінапляцоўкі ў Ленінградзе ад беларускай грамадскасці [2, с. 128, 139; 11, с. 82–83].

**Беларусізацыя.** Працэсы беларусізацыі ў міжваенным кінематографе і кінапракаце БССР зараз складана прасачыць. Найбольш паспяхова беларусізацыя магла быць праведзена ў нямым кіно, дзе дастаткова было надпісы на адной мове замяніць ці суправадзіць надпісамі на іншай мове. Паводле загада аддзела агітпрапа пры ЦК КП(б)Б, усе нямыя фільмы савецкай вытворчасці павінны былі мець надпісы на беларускай мове [12, с. 184]. Паводле рэзалюцыі ЦК КП(б)Б ад 05.03.1928 г., усе карціны Белдзяржкіно ў

[7] Яшчэ вясной 1933 г. Белдзяржкіно было выведзена са складу ленінградскага *Совкино* і непасрэдна падпарадкавана СНК БССР, але вясной 1938 г. пастановай СНК БССР трэст быў ліквідаваны, а яго мінская і ленінградская маёмасць перададзена Камітэту па справах кінематаграфіі пры СНК [2, с. 118, 145; 5, с. 104; 11, с. 109]. Паколькі ў пачатку 1939 г. меркаваўся перанос беларускай сталіцы ў Магілёў, будаўніцтва кінастудыі ў Мінску было спынена [11, с. 140].

[1] Так, у маі 1932 г. улады канстатавалі, што сярод акцёраў кінафабрыкі ў Ленінградзе не маецца ніводнага беларуса, сярод творчых работнікаў – толькі два беларусы [11, с. 102].

[2] Улетку 1940 г. у Інстытуце кінематаграфіі ў Маскве на акцёрскім факультэце было створана беларускае аддзяленне на 10 чалавек [11, с. 144].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

горадзе мусілі дэманстравацца на беларускай і рускай мовах, а на вёсцы – выключна на беларускай мове, пры гэтым раілася звярнуць увагу на якасць гэтай мовы [4, с. 311; 7, с. 25]. У канцы 1920-х гг. у 70% карцін, што дэманстраваліся Белдзяржкіно, меліся надпісы на беларускай мове, 30% паказваліся з надпісамі на дзвюх мовах – рускай і беларускай [12, с. 184]. У фільмах, знятых Белдзяржкіно, надпісы рабіліся часта на беларускай і яўрэйскай ці на беларускай і польскай мовах [2, с. 96].

Са з’яўленнем гукавога кіно ўзнікла праблема, на якой мове здымаць на *Савецкай Беларусі* карціны, паколькі іх пракат у адной БССР і блізка не акупляў выдаткаў на стварэнне. Першымі гукавымі карцінамі кінафабрыкі ў Ленінградзе былі два агітпрапфільмы 1932 г. для дзяцей: *Печать времени* (экранізацыя лялечнага спектакля) на рускай мове і *Пераможцы* на беларускай мове [8, с. 172–173, 255, 257]. Мастацкія фільмы 1932–1935 гг. рабіліся на розных мовах у залежнасці ад тэматыкі: карціна «інтэрнацыянальнага» зместу (гэта значыць на замежную тэматыку) *Слава мира* (1932–1933) была пастаўлена на рускай мове; кінастужка з яўрэйскага жыцця *Вяртанне Нейтана Бекера* (1932) ствралася ў двух варыянтах – рускім і на ідыш, фільм з жыцця беларускай вёскі *Двойчы народжаны* (1933–1934) ставіўся на беларускай мове, а ў агульнасаюзным пракаце ішоў з субцітрамі на рускай мове; карціны *Першы ўзвод* (1932–1933) і *Залатыя агні* (1934–1935) здымаліся адначасова ў двух варыянтах – на беларускай і рускай мовах [2, с. 96][3]. На жаль, звестак наконт мовы іншых гукавых кінакарцін *Савецкай Беларусі* няма[4].

Невядома, ці заўжды на рускай мове дэманстраваліся ў БССР 1930-х гг. астатнія савецкія фільмы – яны маглі мець беларускія субцітры[5]. Здаецца, што гукавых беларускамоўных версій гэтых фільмаў усё-такі не існавала, паколькі вясной 1941 г. у друку паведамлялася, што кінастудыя *Савецкая Беларусь* працуе над дубліраваннем на беларускую мову лепшых савецкіх фільмаў, для

---

[3] Першым фабульным фільмам на беларускай мове стаў *Двойчы народжаны* [8, с. 162–165, 169–172, 249, 250, 254].

[4] Паводле тагачаснай практыкі кінафабрыкі ў Ленінградзе, на беларускай мове здымаліся фільмы «беларускай» тэматыкі [2, с. 96]. Да іх ліку належаць карціны *Паўналецце* (1934–1935), *Зямля наперадзе (Інжынер Гоф)* (1935, стужку паспелі паказаць толькі ў БССР, пасля чаго забаранілі [11, с. 124]), *Дняпро ў агні* (1935–1937), *Дачка радзімы* (1937), *Салавей* (1937), *11 ліпеня* (1938–1939), аднак ці мелі яны беларускамоўныя варыянты – невядома.

[5] Так, у 1933 г. пры Белдзяржкіно быў створаны сектар па пракаце кінакарцін на вёсцы [10, с. 70], хаця яшчэ ў 1920-я гг. у трэсце меўся аддзел «Кіно – вёсцы» [7, с. 25].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чаго прыцягнуты лепшыя артысты БССР [2, с. 152; 11, с. 145]. Аднак нямое кіно захоўвалася ў БССР да канца 1930-х гг. (табл. 2).

**Кінафікацыя** БССР зрабілася важнай мэтай улад фактычна толькі з канца 1920-х гг., калі з пачаткам індустрыялізацыі і калектывізацыі на гэты кірунак дзейнасці сталі вылучацца дастатковыя фінансавыя сродкі. У табліцы 2 паказана, што сетка кінаўстановак у БССР пасля скачка ў 1930 г. марудна развівалася ў гарадах і значна больш дынамічна – на вёсцы[6].

*Табліца 2*

**Лік кінаўстановак БССР у 1927–1939 гг.**
**(паводле стану на пачатак кожнага года)**

| Знаходжанне | 1927 | 1928 | 1929 | 1930 | 1931 | 1932 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Вёска | 11 | 58 | 216 | 241 | 333 | 453 |
| у тым ліку гукавых | – | – | – | – | – | – |
| Горад | 35 | 197 | 160 | 278 | 274 | 322 |
| у тым ліку гукавых | – | – | – | – | – | – |
| Усяго | 46 | 255 | 376 | 519 | 607 | 775 |
| у тым ліку гукавых | – | – | – | – | – | – |

| Знаходжанне | 1933 | 1934 | 1935 | 1936 | 1937 | 1938 | 1939 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Вёска | 598 | 542 | 654 | 777 | 726 | 668 | 652 |
| у тым ліку гукавых | – | – | 6 | 58 | 149 | 203 | 291 |
| Горад | 349 | 352 | 405 | 350 | 278 | 311 | 411 |
| у тым ліку гукавых | 9 | 20 | 28 | 54 | 86 | 136 | 315 |
| Усяго | 947 | 894 | 1061 | 1 127 | 1 004 | 979 | 1 063 |
| у тым ліку гукавых | 9 | 20 | 34 | 112 | 235 | 339 | 606 |

*Заўвага.* Вынiковая лічба за 1935 г. – паводле крыніцы (відаць, памылка, сума складае 1 059) [9, с. 50].

Увосень 1930 г. у Мінску быў створаны першы гукавы кінатэатр *Чырвоная зорка*, які стаў чацвёртым у СССР пасля Ленінграда, Масквы і Харкава. Першая гукавая праграма (кінахроніка, мультыплікацыя, танцавальна-музычныя эпізоды) у ім прайшла на

6 Паводле іншых крыніц, на 1932 г. прыпадае 1063 устаноўкі: 91 гарадская, 300 клубных, фабрычна-заводскіх, чырвонаармейскіх, 35 вясковых, 598 перасоўных, 76 вучэбных [6, с. 105]. Таму можна меркаваць, што ў табл. 2 адлюстравана наяўнасць кінаўстановак выключна ў цывільным грамадстве, без уліку ўстановак вайсковых частак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускай мове [2, с. 96–97; 11, с. 104–105]. Аднак на гэтым яго дзейнасць, здаецца, і скончылася. Распаўсюджанне гукавога кіно ў БССР пачынаецца фактычна толькі з сярэдзіны 1930-х гг. (гл. табл. 2), а на вёсцы з ім сяляне яшчэ доўгі час былі не знаёмыя[7]. У адрозненне ад тэатра, кіно мела няшмат большую аўдыторыю. Так, у 1932 г. сістэма Белдзяржкіно абслужыла 7,5 млн гледачоў [6, с. 105], тады як у 1931 г. кінасеансы наведала 2,5 млн гледачоў [10, с. 70].

**Заключэнне.** Беларускі кінематограф і кінапракат, што ўзнік у першай палове XX ст., доўгі час развіваўся фактычна як гарадская з'ява. Толькі ў 1930-я гг. беларуская вёска з ім знаёміцца, калі распачынаецца больш-менш шырокая кінафікацыя БССР. Пры гэтым гукавое кіно ў жыццё вяскоўцаў прыходзіць толькі з канца 1930-х гг. І гэта было, відаць, рускамоўнае кіно, паколькі беларусізацыя на той час прыйшла ў заняпад. Беларусізацыя ў галіне кінематографа мела поспех толькі ў 1920-я гг., што палягчалася тэхнічнымі абставінамі нямога кіно. Аднак са з'яўленнем гукавога кіно ў першай палове 1930-х гг. сітуацыя з пранікненнем беларускай мовы на экраны значна ўскладнілася, што было абумоўлена не столькі палітычнымі перашкодамі, колькі арганізацыйнымі праблемамі. Узніклы ў 1920-я гг. беларускі кінематограф амаль да вайны знаходзіўся за межамі Беларусі (хаця і фінансаваўся з Мінска) і арыентаваўся пераважна на агульнасаюзную і рускамоўную аўдыторыю. Гэта вельмі абмяжоўвала кантроль за ім з боку беларускіх улад і ўскладняла рост нацыянальных творчых кадраў, якія сутыкаліся з небяспекай ператварыцца ў правінцыяльны дадатак расійскага кінематографа.

1. Все белорусские фильмы: каталог-справочник : в 2 т. / сост. И. Авдеев, Л. Зайцева. – Минск : Беларус. навука, 1996. – Т. 1 : Игровое кино (1926–1970). – 238 с.

2. Гісторыя кінамастацтва Беларусі : у 4 т. / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі. – Мінск : Беларус. навука, 2001–2004. – Т. 1 : 1924–1959 гг. / А. В. Красінскі. – 2001. – 278 с.

3. *Ешин, С. З.* Развитие культуры БССР за годы Советской власти / С. З. Ешин. – Минск : Выш. шк., 1970. – 256 с.

[7] Паводле некаторых звестак, гукавыя кінаўстаноўкі з'явіліся ўжо ў 1932 г. – 9 у горадзе і 3 у вёсцы [6, с. 105].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Идеологическая деятельность Компартии Белоруссии, 1918–1945 : в 2 ч. / сост. Н. С. Сташкевич [и др.]. – Минск : Беларусь, 1990. – Ч. 1 : 1918–1928. – 358 с.

5. История белорусского кино. [Т. 1] 1924–1945 / авт. А. В. Красинский [и др.]. – Минск : Наука и техника, 1969. – 240 с.

6. Итоги выполнения первого пятилетнего плана развития народного хозяйства БССР. – Минск : Изд-во Госплана : УНХУ БССР, 1933. – 159 с.

*7. Каляда, І. У.* Беларусізацыя : Шляхі і метады ажыццяўлення : тэксты лекцый / І. У. Каляда ; Беларус. дзярж. тэхнал. ун-т. – Мінск, 1997. – 31 с.

*8. Кобец-Філімонава, А.* Калі ўцякала сонца : Творчасць Рыгора Кобеца, яго жыццё і пакуты / А. Кобец-Філімонава. – Мінск : Кнігазбор, 2006. – 464 с.

9. Культурное строительство БССР : стат. справ. – Минск : Изд-во УНХУ БССР, 1940. – 111 с.

*10. Сафонова, О. В.* Культурное строительство в белорусской деревне в период построения социализма (1926–1937 гг.) / О. В. Сафонова. – Минск : Наука и техника, 1978. – 102 с.

*11. Смаль, В. И.* Сквозь призму десятилетий : О политике компартии Белоруссии в области киноискусства в 20–30-е годы / В. И. Смаль. – Минск : Наука и техника, 1980. – 150 с.

*12. Głogowska, H.* Białoruś 1914–1929 : Kultura pod presją polityki / H. Głogowska. – Biłystok : Orthdruk, 1996. – 238 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ